*Г. А. Барвенава, дацэнт*

# ХРАМАВАЕ ТЭКСТЫЛЬНАЕ БАГАЦЦЕ БЕЛАРУСІ Ў ЭПОХУ СЯРЭДНЯВЕЧЧА

Кожная царква і яе святыні аздабляюцца золатам, серабром, а таксама каштоўнымі тканінамі, якія ва ўсе часы, асабліва ў Сярэднявеччы, знаходзіліся ў адным шэрагу з каштоўнымі металамі [5]. Узвялічваючы славу Бога, “*прыгатуй царкву і клір і сам апраніся ў свяцікельскія рызы, каб бачылі яны славу Бога нашага"* (987 г.), таму храмавыя багацці назапашваліся стагоддзямі рознымі шляхамі.

Кожны чалавек дарue царкве згодна сваім магчымасцям, як гаворыцца ў “Слове Кірылы Тураўскага ў новую нядзелю па пасцы” (да 1174 г.): “*Днесь ... новая Богови приносятся: отъ языкъ вѣря, отъ крестьянъ требы, отъ іерей – св. жертвы, отъ міродержитель – боголюбныя милостыня, отъ велможь – церковьное попеченіе, отъ праведникъ – смиреномудріе, отъ грѣшникъ – истиньное покояніе, отъ нечестивыхъ – обращеніе къ Богу, отъ ненавидящіихъся – духовная любы”* [12, с. 246]. Каштоўныя тканіны (сярод іншых каштоўных дароў) прыносілі як багацейшы дар у цэрквы і кляштары князі і баяры. “*Нынѣ небеса просвѣтишася, отъ темныхъ облакъ, яко вретища съвлекъшися ... и светлым воздухомъ славу господню исповѣдаютъ*” [12, с. 244]. Таму князі як абавязак, так і “*въ память събѣ”* будавалі і аздаблялі храмы. “*Князъ Володимеръ* (да 1288 г.) *... в Каменець ... Тако же и у Бѣльску.... пречистыа Богородица окова сребромъ съ каменіемъ дорогымъ, и завѣсы золотомъ шиты, а другые оксамитные съ дробницею, и всѣми узоричіи украси ю. ... въ Любомли ... и платци оксамитны шиты золотомъ съ жемчюгомъ, херувимъ и серафимъ, и иньдитья золотомъ шита вся, а другаа паволокы бѣлчатое, а вь малою алтару обѣ иньдитьи бѣлчатое же паволокы; ... еуангеліе апракосъ же волочено оловиромъ и цяту възложи на не съ финиптомъ ...*” [12, с. 192–193]. Шмат каштоўнейшага багацця дзякуючы дарам духоўным і маёмасным, напрыклад полацкай

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

княжацкай дынастыі, было назапашана на Полацкай зямлі. Пра полацкую княжну Звеніславу (Еўпраксія), якая “*хощу поклонити главу под иго Христово ... принесе всю свою утварь златую и порты многоцѣнныя в монастырь ко Еуфросинии”*, расказана ў “Жыціі блажэныя Еуфросинии...” [6, с. 60]. На працягу ўсяго Сярэднявечча княжацкія і каралеўскія майстэрні выконвалі заказы царквы і заказы караля і каралевы для царквы: каштоўныя тканіны з вышыўкай золатам, серабром, перламі для алтара, уборы святароў, харугвы і шмат іншага [5].

Даніна царкве была адной з важнейшых крыніц накаплення, у тым ліку тэкстыльнага багацця. У год 996: “*Убачыў Уладімір, што царква пабудавана, увайшоў у яе і памаліўся Богу ... І пасля малітвы Богу сказаў ён так: “Даю царкве гэтай святой Багародзіцы дзесятую частку ад багаццяў маіх і маіх гарадоў”. І пастанавіў так, напісаў закляцце ў царкве гэтай і сказаў: “Калі хто адменіць гэто, – да будзе пракляты”.* Тканіны і тэкстыльныя вырабы ўваходзілі ў даніну для епіскапатаў: “*дані ... урока 40 гр. і 15 лісіць і 10 черныхъ кунъ ... половочнікъ, 2 скатерті, 3 убрусы ...*” (1150 г.) [12, с. 681].

Прадметам раскошы ў Сярэднявеччы быў у першую чаргу шоўк, таму менавіта шаўкамі аздаблялі храмы, з шоўку шыліся не толькі каралеўскія і княжацкія касцюмы, але і цырыманіяльнае адзенне святароў для памнажэння славы Зямлі і Царквы. Аздоба сцен храма каштоўнымі тканінамі была шырока распаўсюджана на Русі на працягу ўсяго Сярэднявечча, таму што “*і заповѣда ему г(с)ь. яко створити ему. храмъ скынья і злато(м)... и всякымь ізбраниемь. вусъсомь же же и перфирою*” [8, с. 69]. Нават у арнаментальных роспісах храмаў *“пісьменемъ”* красуюць тэкстыльныя матывы – нацягнутая каштоўная тканіна, заслоны (імітацыя падвешанай праз пэўную адлегласць трохі правісаючай тканіны), трунныя заслоны, якія выступаюць і як знакі-сімвалы (“геральдычнага” характару [2, с. 41–42], выявы раю, райскіх птахаў), і як выразны дэкор храмаў (канцэнтрацыя ў алтарнай і паўднёва-заходняй частках храмаў) [1; 2, с. 39, 41, 147; 10].

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Каштоўныя візантыйскія і ўсходнія тканіны з кляштара, як багацце, вывешваліся ў храме падчас храмавых і дзяржаўных свят, станавіліся прыкладам арнаментальных кампазіцый роспісаў [2, с. 150]. Кампазіцыі перадаваліся мастакамі праз удумлівы дакладны перанос арнаментыкі і каларыстыкі [16] або праз іх пераасэнсаванне, мастацкую перапрацоўку, трансфармацыю (адлюстраванне птушак не цалкам, а "па пас", пазбаўленне іх падкрэсленай драпежнасці), пакідаючы нязменным кампазіцыю і знакі-сімвалы [2, с. 39; 10]. Дзякуючы насычанасці храма тэкстылем геаметрычныя матывы (найперш круг у крузе, квадраты, клеткі) пераходзілі ў іншыя віды мастацтва, а арнаментыка тунікі і мантыі пры адлюстраванні князёў-пакутнікаў з часоў Сярэднявечча стала кананічнай.

Тэкстыль назапашваўся ў царкве і як удзячнасць за вынік гандлёвых пагадненняў або дапамогу ў іх удасканаленні. Купцы ў Сярэднявеччы ахвотна давалі грошы на пабудову цэркваў, сабораў і кляштараў, бо там захоўвалі найбольш каштоўныя тавары, купецкія касы і архівы купецкіх брацтваў, гандлёвыя кнігі, дагаворы, граматы, уласныя грошы, дакументы і інш. "*Въ лѣто 1340 г. ... а иное зліи человѣци пограбиша. ... а иныхъ надъ своимъ товаромъ побиша, а товары собѣ поимаша, и въ св. церквахъ, идѣже бы всякому хрестьяняну хотя бы и свой домъ повергя (бросить), а церкви постеречи. Церковь святыхъ 40 (мучеников) ... запершеся въ церкви товаръ весь разграбиша, а иконъ и книгъ не даша носити, а сами избѣгоша изъ церкви, все зъгорѣ, и сторожа два убиша. А у св. Богородици въ торгу попъ сгорѣ ... а товаръ весь пограбиша ... а всѣхъ церквей погорѣ 50*" [12, с. 214–216]. Калі за правіннасць арыштоўвалі тавар, то "*положено въ церкви*" (1471 г.) [9, т. 2, с. 36–37]. Царкоўная плошча, як прынята па ўсёй Еўропе, з'яўлялася і гандлёвай [4], а ў дзень адкрыцця гандлю над плошчай падымалі крыж, харугвы і сцяг князя. Вагі, гіры, а таксама меры эталонныя даўжыні і вагі захоўваліся ў царкве, таму царква мела прыбытак у выглядзе платы за выкарыстанне царкоўных памяшканняў і мер: "*...далъ есми судъ и мѣрила, якоже на торгу св. Богородици ...*

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

*митрапалиту ... и епископу ... мерила торговыя ... и локоть... и свой оброкъ купецъ черницамъ”* [12, с. 670]. Таму свае храмы славяне будавалі ва ўсіх асноўных гандлёвых цэнтрах за межамі нашых княстваў, напрыклад у Канстанцінопалі, Рызе, і яны апекаваліся нашым епіскапатам [9, т. 1, с. 62, 98; т. 2, с. 28, 58, 93, 106].

Акрамя гэтага, у заключэнні дзяржаўных і гандлёвых пагадненняў, вырашэнні праблемных гандлёвых сітуацый удзельнічала вышэйшае духавенства, адпаведна гандлёвыя граматы і пагадненні падмацоўваліся не толькі пячаткамі князя, але і епіскапата, як на “Гандлёвым пагадненні Полацка і Рыгі 1405 г.”, дзе побач з подпісам і пячаткай вялікага князя Вітаўта стаяла пячатка архіепіскапа [9, т. 1, с. 96–107]. Святары ўдзельнічалі ў перамовах: “*едуть боаре и мѣщане полоцкиѣ до арцибискупа*, и *они о всемъ ... размовать”* (1469 г.), у пасольствах [9, т. 2, с. 15–16, 70–71], былі паручыцелямі: “*...намъ жалуеть Прошко Дыбиничь на попа на Никольского на Ивана, занже тотъ Прошько изгибъ оу поруце по томъ попѣ. ... намъ до него есть дела векая”* (1458 г.) [9, т. 1, с. 193] – і выступалі ў іншых ролях, а за гэта мелі падзяку.

У раннім Сярэднявеччы ткацтвам і вышыўкай займаліся амаль у кожнай кляштарнай гаспадарцы, у першую чаргу на ўласныя патрэбы. Таму Феадосій Пячэрскі з іншымі братамі па веры ў 1062 г. стварыў царкву з агароджай, паставіў шмат келляў “... *и рукама свима дѣляхуть дѣло, ово ли копытьца (панчохи) плетущи и клобукы (шапки), и ина ручная дѣла строяще, и тако носяще въ градъ, продаяху, и тѣмь жито купяху, и се раздѣляхуть...*”; ... *въ нощи, излѣзъ надъ пещеру и обнаживъ тѣло свое до пояса, сѣдяше прядыи вълну на съплетѣние копытьцемъ, и псалтырь же Давидову поя, отъ множьства же овода и комара все тѣло его покръвено будыше ...”* [12, с. 369–370]. Таксама рабілі ніткі, неабходныя для кніжнай справы, сам Феадосій “*...смиренно ... прялъ нитки для переплёта книгъ”*.

Але паступова тэмпы развіцця тэкстыльнага рамяства ўдасканальваліся, а з сярэдзіны XIII ст. ткацтва стала сродкам заробку некаторых кляштараў, іншыя кляштары прафесійна

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

перапісвалі і ілюстравалі кнігі: “*... церковные люди, ремесленицы кои, или писцы, или каменные здатели или древодѣлные, или иные мастеры каковы ни буди ...*” [12, с. 518]. Тэкстыльнымі цэнтрамі сталі па ўсёй Европе цыстэрцыянскія кляштары (у XII–XIII стст. больш за 700 абацтваў), якія працавалі на землях Польшчы ад 40-х гг. XII ст. (24 кляштары Малой Польшчы ў XII ст. мелі месіянерства на Русі), а таксама кляштары бегінак (з’явіліся ў Польшчы ў сярэдзіне XIII ст.), дзе ткацтва ўказана ў рэгулах, а па статуту яны мелі адмысловыя ткацкія флігелі [15, с. 58]. Ужо ў канцы XIII ст. тэкстыльная прадукцыя цыстэрцыянцаў і бегінак не вытрымала мацнейшай канкурэнцыі гарадскога ткацтва [13; 14], што і стала адной з прычын рэпрэсій на бегінак (у пачатку XIV ст. касцёлам прызнаны за ерэтыкоў, а ў наступным стагоддзі распушчаны) [15, с. 59]. Кляштары кларысак да нашага часу захавалі адну са сваіх спецыялізацый – вышыўку і рэстаўрацыю тэкстылю.

Тэкстыль нараўне з каштоўнымі металамі быў асноўным сродкам выкупу, даніны, падпарадкавання. *“И ту дворъ Святославъ раздѣли ... и товаръ Церковь св. Възнесенія всю облупиша, съсуды серебряныя, и платы служебныя, а всё шито золотомъ...”* (1146 г.) [12, с. 1158]. *“Въ лѣто 1340 Казимеръ король Полскій... обляже (Львовъ)... обрѣте бесчисленная сокровища и богатства, отъ злата и сребра и каменія многоцѣннаго... же обрѣте тамо два кресты отъ злата чиста, посажена каменіем многоцѣннымъ... Обрѣте же тамо и двѣ коронѣ отъ злата и каменія многоцѣнного, и престолъ царскій отъ злата и каменія многоцѣнного, и престолъ царскій отъ злата и каменія, и одежду златотканую со каменіемъ, и прочее, еже все побра Казимеръ и въ Краковъ отнесе”* [12, с. 1451–1452].

Назапашанае тэкстыльнае багацце, што прыносілі як удзячнасць Богу за прыняцце душы і цела, шматлікімі шляхамі набывалася, захоўвалася і памнажалася стагоддзямі як святыя і недакранальныя каштоўнасці сабораў і дзяржавы. Сучасныя музеі света і храмы экспануюць храмавыя каштоўнасці, але яны як

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

належалі пэўнаму храму, так і належаць, а дзяржава, музей рэстаўруюць і наладжваюць дастойную захаванасць. Калі б не прыпынялася на нашых землях сусветная традыцыя захавання і недакранальнасці храмавых багаццяў, мы б сёння ганарыліся не адзінкавымі ўзорамі сярэднявечных тэкстыльных экспанатаў [11], а багацейшымі зборамі.

---

1. *Воронин, Н.Н.* Бельчицкие руины (к истории полоцкого зодчества XII в.) / Н.Н.Воронин // Архитектурное наследство. – 1956. – № 6. – С. 20.

2. *Воронин, Н.Н.* Смоленская живопись 12–13 вв. / Н.Н.Воронин. – М.: Искусство, 1977. – 183 с.

3. *Гуревич, Ф.Д.* Древний Новогрудок: Посад – окольный город / Ф.Д.Гуревич. – Л.: Наука. Ленингр. отд-ние, 1981. – 159 с.

4. *Галубовіч, В.І.* Эканамічны стан, побыт і гандаль Старажытнай Беларусі (IX–XIII стст.) / В.І.Галубовіч. – Мн.: Экаперспектыва, 1997. – 175 с.

5. *Дэкаратыўна-прыкладное* мастацтва Беларусі XII–XVIII стагоддзяў: альбом / аўт. тэксту і склад. Н.Ф.Высоцкая. – Мн.: Беларусь, 1984. – 235 с.; *Маясова, Н.А.* Древнерусское шитье: альбом / Н.А.Маясова. – М.: Искусство, 1971. – 34 с.; *Маясова, Н.А.* Русское художественное шитьё XIV – начала XVIII века: каталог выст. / авт. вступ. ст. и сост. каталога: Н.А.Маясова, И.И.Вишневская. – М.: Искусство, 1989. – 136с.; *Свирин, А.Н.* Древнерусское шитьё / А.Н.Свирин. – М.: Искусство, 1963. – 152 с.; *Gutkowska-Rychlewska, M.* Polskie hafty średniowieczne: katalog wystawy Museum Narodowego w Krakowie / M.Gutkowska-Rychlewska, M.Taczycka. – Kraków: Antykwa, 1967.

6. *Житие* блаженыя Еуфросинии, игумении Вседрьжителя Святаго Спаса во градѣ в Полодсцѣ // Старажытная беларуская літаратура / уклад. Л.С.Курбека. – Мн.: Юнацтва, 1990. – С. 54–66.

7. *Загорульский, Э.М.* Возникновение Минска / Э.М.Загорульский. – Мн: Изд-во Бел. гос. ун-та, 1982. – 358 с.

8. *Лукина, Г.Н.* Предметно-бытовая лексика древнерусского языка / Г.Н.Лукина. – М.: Наука, 1990. – 180 с.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

9. *Полоцкие* грамоты XIII – начала XVI в.: указ.: в 4 т. / Акад. наук СССР, Ин-т истории СССР; сост. А.Л.Хорошкевич. – М., 1978–1989. – Т. 1–4.

10. *Селицкий, А.А.* Живопись Полоцкой земли XI–XII вв. / А.А.Селицкий. – Мн.: Навука і тэхніка, 1992. – 171 с.; *Селицкий, А.А.* Орнаменты древних смоленских храмов / А.А.Селицкий // Древности Белоруссии и Литвы: сб. ст. / науч. ред.: Л.Д.Поболь, А.З.Таутавичюс. – Мн.: Наука и техника, 1982. – С. 144–152.

11. *Сергеева, З.М.* О распространении шелковых тканей в памятниках X–XIII вв. Беларуси / З.М.Сергеева // Гісторыка-археалагічны зборнік. – 1996. – № 8. – С. 194–197; *Фехнер, М.В.* Шёлковые ткани в средневековой Восточной Европе / М.В.Фехнер // Сов. археология. – 1982. – № 2. – С. 57–70.

12. *Хрестоматия* по русской истории для изучения древнерусской жизни, письменности и литературы, отъ начала письменности до XVI вѣка / сост. Н.Я.Аристовъ. – Варшава: Изд. В.Ф. Голубинского, 1870. – 1514с.

13. *Maik, J.* Wyroby włókiennicze na Pomorzu z okresu rzymskiego i ze średniowiecza / J.Maik. – Wrocław; Łódż: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1988. – 206 s.

14. *Nahlik, A.* Tkaniny wełniane importowane i miejscowe Nowgrodu Wielkiego X–XV wieku / A.Nahlik. – Wrocław: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1964. – 156 s.

15. *Zarys* historii włókiennictwa na ziemiach polskich do końca XVIII wieku / pod red. J.Kamińskiej, I.Turnau. – Wrocław: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1966. – 687 s.; Cystercy w kulturze sredniowiecnej Europy. – Poznań, 1992. – 88 с.

16. *Роспіс* труннага покрыва ў Смаленскім храме імітаваў накінутую на труну заслону з каштоўнага шоўку даўжынёй 1,8 м, гарызантальная частка шырынёй 80 см, вертыкальная – 70 см (тканіна мела шырыню 1,50 м) [2, с. 38].

БИБЛИОТЕКА БГУКИ